# Гістарычныя сады і паркі Беларусі

*(Заканчэнне артыкула. Пачатак у № 15)*

## Губернатарскі парк у Мінску




*Велатрэк у Губернатарскім парку. Паштоўка 1912 г.*

У XIX стагоддзі беларускія гарады значна змяніліся, там пачалі з'яўляцца паркі, скверы і бульвары. Так, у 1800 годзе мінскі губернатар Захар Карнееў заклаў у горадзе парк, які потым у яго гонар назвалі Губернатарскім садам. Гэта быў парк пейзажнага тыпу. Свіслач дзяліла яго на дзве тэрасы. Ніжнюю частку парку аздаблялі штучны ручай і дэкаратыўныя вадаёмы. Захаваліся апісанні парку, зробленыя ў 1810 годзе. Вандроўнікі ім захапляліся і адзначалі, што «мінскі сад» размешчаны па ўзоры англійскіх. Пасля 1858 года планавалі вялікую рэканструкцыю і пашырэнне парку, але гэтыя планы не былі рэалізаваныя. У 1912 годзе тут пабудавалі аранжарэю. У пачатку XX стагоддзя ў парку з'явіўся велатрэк, дзе гараджане маглі ездзіць на роварах, як на сваіх, так і ўзятых напракат. На жаль, у 1970-я гады велатрэк знеслі. Пасля 1917 года парк атрымаў назву сад «Профінтэрн», а ў 1936 годзе яму надалі імя Максіма Горкага. У 1981 годзе паставілі помнік у гонар пісьменніка.

Пасля вайны тэрыторыя парку павялічылася за кошт суседніх зруйнаваных кварталаў і дасягнула памераў у 22 гектары. Тут пасадзілі шмат новых дрэў і кустоў, збудавалі летні «зялёны тэатр» на 1800 месцаў. Тэрыторыю абнеслі цаглянай агароджай з металічнымі кратамі, заасфальтавалі алеі і пляцоўкі. З 1952 года гэта быў парк культуры і адпачынку, а з 1960-га – дзіцячы парк з атракцыёнамі. На месцы велатрэка пабудавалі крыты каток для хакеістаў і фігурыстаў. У 1952 годзе быў зроблены галоўны ўваход у стылі неакласіцызму па праекце архітэктара Г. Заборскага. У парку растуць больш за 60 парод дрэў і кустоў, у асноўным мясцовых парод. Але ёсць і рэдкія расліны: хвоя кедровая, піхта каліфарнійская, лістоўніца еўрапейская і іншыя.

## Гомельскі парк

Другім старадаўнім гарадскім паркам Беларусі з'яўляецца гомельскі. Ён узнік у гістарычным цэнтры горада на месцы дзядзінца і пазнейшых драўляных замкаў эпохі Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай Гомель быў перададзены графу Пятру Румянцаву, які збудаваў тут вялікі палац і заснаваў побач парк у пейзажным стылі. Перад галоўным фасадам палаца быў парадны партэр, абмежаваны групамі дрэў і алеямі. Каля другога боку палаца на беразе Сожа зрабілі парадны дворык (курданёр), дзе раслі дэкаратыўныя кусты і знаходзіўся прыгожы газон. Пасля 1834 года ў палаца і парку з'явіўся новы гаспадар – граф Іван Паскевіч. Ён сур'ёзна заняўся перабудовай палаца і паркам. Зімой 1848 года з навакольных лясоў прывезлі і пасадзілі тут вялікія дубы, клёны, грабы, вязы і ясені. Наступнай зімою ў парку пасадзілі 50 відаў вялікіх і 300 дробных дрэў, прывезеных з Варшавы, а таксама шмат цяплічных раслін. Такім чынам пашырыўся парадны партэр, а кампазіцыя парку набыла рамантычны характар. На дне глыбокага яра і ручая Гамяюк зрабілі Лебядзінае возера. У парку з'явіліся гроты, памятныя камяні і розныя скульптуры. Над возерам – вісячы мосцік, што вёў у пладовы сад. На алеях парку паставілі скульптуры старажытных філосафаў, воінаў і паэтаў, а ў садзе над Сожам – скульптуру Івана Паскевіча ў выглядзе рымскага палкаводца.

У канцы XIX – пачатку XX стагоддзя парк зноў павялічыўся да 25-і гектараў. Тут пасадзілі шмат экзотаў і кветнікаў. Парк добра захаваўся да нашых дзён, яго прысады і насаджэнні вылучаюцца вялікай разнастайнасцю. Тут растуць рэдкія экзоты, прывезеныя з Парыжа, – дуб чэрашчаты, каралінскія і амерыканскія ліпы. Паўднёвы парк – гэта ўнікальная зона адпачынку.

## Лошыцкі парк

У другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя на садова-паркавую архітэктуру вялікі ўплыў зрабілі гістарызм і эклектыка, а потым і мадэрн. Адбылося ўскладненне структуры паркаў з падзелам на пейзажныя і рэгулярныя зоны. Рысы мадэрну надалі сядзібнаму дойлідству асіметрычнасць, кампазіцыю з рознавялікіх аб'ёмаў пад адным складным дахам. Так, пошук новага праявіўся ў знешнім дэкоры Лошыцкай сядзібы (1890 года) на тагачаснай ускраіне Мінска.

Ужо ў XVI стагоддзі існавалі феадальныя двары Лошыцкі і старыя Лошыцы, якімі валодалі князі Друцкія-Горскія. У XVIII стагоддзі маёнтак належаў Прушынскім, якія ў другой палове XVIII стагоддзя стварылі тут барочную сядзібу. Ад яе захавалася ўязная ліпавая алея, што знаходзіцца на асноўнай кампазіцыйнай восі былога барочнага ансамбля. Захаваўся інвентар сядзібы 1772 года, які сведчыць, што тут быў вялікі сад і прамавугольны вадаём з мостам.

Пасля 1890 года парк страціў сваю рэгулярнасць, на месцы баскетаў з'явіліся пейзажныя кампазіцыі. Дом з флігелем утвараюць вялікі парадны двор з некаторымі барочнымі элементамі: тэрасіраваныя схілы і клумба з ліпавымі дрэвамі. Часткова захавалася ўязная ліпавая алея, што ішла ад былога Ігуменска-Мінскага тракту. Яна вылучаецца магутнымі ліпамі, узрост якіх складае каля 250-і гадоў. У аснове кампазіцыі пейзажнай паўночнай часткі парку ляжыць паляна, ахопленая з боку саду паласою дрэў. Частку парку на крутым грэбені тэрасы складаюць ліпы XVIII стагоддзя і адзінкавыя (яшчэ больш старыя) дубы. Другая паляна знаходзіцца ў паўночнай частцы парку ў пойме рэчкі Лошыцы. Да гістарычнай сядзібы прымыкаюць сады, былыя гадавальнікі і калекцыі беларускага аддзела Усесаюзнага інстытута раслінаводства. Такім чынам, агульная плошча парку складае 100 гектараў.



*Лошыцкі парк сёння. Фота Сяргея Плыткевіча*

## Парк Янкі Купалы

Пасля Другой сусветнай вайны ў Беларусі ўзніклі ў нашых гарадах новыя паркі, скверы і бульвары. Адзін з іх узнік у цэнтры Мінска і быў заснаваны ў 1949 годзе на месцы гарадской забудовы, знішчанай пад час вайны. Паколькі тут да вайны быў дом Янкі Купалы, то ў 1962 годзе парк атрымаў імя ў гонар класіка беларускай літаратуры.

У 1950 годзе было пасаджана больш за 4 тысячы дрэў і вялікая колькасць дэкаратыўных кустоў, вызначаны асноўныя алеі. Берагі Свіслачы, якая працякае праз парк, «апранулі» ў камень і бетон. Каля галоўнага ўваходу ў парк зрабілі фантан са скульптурнай кампазіцыяй «Купалле», а таксама скульптурную кампазіцыю «Вянок». У 1959 годзе ў парку ўзвялі будынак Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы. Парк з'яўляецца цікавым прыкладам архітэктурнай спадчыны савецкага перыяду.

*Алег ТРУСАЎ*



*Алея ў парку Янкі Купалы*